# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА (1490–1551) – ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ, МЫСЛІЦЕЛЬ, ПЕРШАДРУКАР, АСВЕТНІК, АДВАКАТ

**Людміла ГОЛУБЕВА,**
**кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ**

**У гісторыі Беларусі выразна выдзяляецца перыяд Адраджэння, або Рэнесанса – XVI стагоддзе, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага – адной з буйнейшых дзяржаў Еўропы – якое ў той час дасягнула найбольшага культурнага, інтэлектуальнага, эканамічнага росквіту. На Беларусь усё больш шырока пранікалі ідэі заходняга Адраджэння, яго гуманізм, вальнадумства і патрыятызм. Кнігадрукаванне, разам з жывапісам, літаратурай, філасофіяй і правам, з'явілася адным з важнейшых сродкаў выражэння новага светапогляду – гуманізму, які ў адрозненне ад панаваўшай рэлігіі паставіў у цэнтр інтарэсаў не бога, а чалавека з яго зямнымі справамі і патрэбамі, гучна абвясціўшы права чалавека на іх задавальненне на зямлі.**

**Прадстаўнікі Адраджэння – гуманісты – шырока выкарыстоўвалі антычную культурную спадчыну (спачатку рымскую, а потым грэчаскую), нібыта «адраджаючы» яе пасля працяглага забыцця ў сярэдневяковым грамадстве.**



*Ф.Скарына, XVI ст. Маст. Вареца Л. і Вареца В. 1993 г. Рэпрадукцыя з камплекта аўталітаграфій «Славутыя людзі Беларусі».*

**Узнікла вялікая патрэба замацавання маладых парасткаў рэнесансавага гуманізму на беларускай глебе. Менавіта гэта і здзейсніў вялікі сын беларускага народа Францыск Скарына.**

Францыск Скарына нарадзіўся ў Полацку ў сям'і купца Лукі Скарыны. Пачатковую адукацыю ён атрымаў у Полацку і ў Вільні. У 1504 годзе паступіў у Кракаўскі універсітэт на факультэт свабодных мастацтваў, які скончыў са ступенню бакалаўра філасофіі. Гуманістычныя ідэі, з якімі ён пазнаёміўся ў Кракаве, захапілі юнака, і ён едзе ў Заходнюю Еўропу, дзе на працягу шасці гадоў удасканальвае свае веды ў розных навуках. У 1512 годзе Ф. Скарына становіцца доктарам філасофіі і ў тым жа годзе Падуанскі універсітэт прысвойвае яму – першаму з усходніх славян – вучоную ступень доктара медыцыны.

У 1516 годзе Ф. Скарына пасяліўся ў Празе, і ў выніку актыўнай выдавецкай дзейнасці на працягу 1517–1519 гадоў былі перакладзены на старабеларускую мову і выдадзены 23 кнігі Бібліі. Першая кніга Ф. Скарыны «Псалтыр» выйшла ў Празе *6 жніўня 1517 года*. Менавіта *гэта дата лічыцца пачаткам беларускага кнігадрукавання*. Заснаванне Скарынам беларускага кнігадрукавання і пераклад Бібліі на нацыянальную мову стала вяршыняй яго духоўнай дзейнасці, бессмяротным подзвігам, найбольш выразным і яскравым пралогам беларускага Адраджэння першай паловы XVI стагоддзя.

Каля 1520 года Ф. Скарына прыехаў у Вільню, дзе ў доме віленскага бурмістра Якуба Бабіча заснаваў друкарню. Каля 1522 года ён выдаў «Малую падарожную кніжыцу», а ў 1525 годзе – «Апостал». Рэнесансавыя выданні Скарыны былі арыентаваны на ўсе слаі насельніцтва. Галоўнай крыніцай для вывучэння светапогляду Ф. Скарыны, яго палітычных і прававых поглядаў з'яўляюцца прадмовы і пасляслоўі наконт палітыкі, права, заканадаўства.

Як дзеяч эпохі Адраджэння Ф. Скарына развіў тэорыю натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы. Ён прапанаваў сваю ўласную класіфікацыю права, якая найбольш поўна выкладзена ў прадмове да кнігі «Другі закон Маісееў». На яго думку, права дзеліцца на натуральнае і пісанае. Натуральнае права (Ф. Скарына называе яго «прироженым») закладзена ў самой істоце чалавека. Яно аднолькавае для ўсіх людзей, уласцівае кожнаму і не залежыць ад месца і часу. Чалавеку пры нараджэнні дадзены асноватворныя маральна-прававыя паняцці, якія спакон веку існуюць у яго сэрцы і розуме. На аснове норм натуральнага права павінна будавацца сістэма норм пісанага права – дзеючага заканадаўства. Пры гэтым натуральнае права выступае асноўным, зыходным у

адносінах да пісанага. Натуральны закон, на погляд Ф. Скарыны, папярэднічае «пісанаму» і гістарычна.

Ф. Скарына лічыў, што імкненне да парадку – гэта натуральная патрэба чалавека і ў аснове прававых (а таксама і маральных) норм ляжыць натуральны закон, напісаны Богам.

Пісанае права Ф. Скарына падзяляў на боскае, царкоўнае (кананічнае) і земскае. Нормы боскага права змешчаны ў кнігах Старога і Новага Запавету. Гэтыя нормы з'яўляюцца сінонімамі волі Бога. Таму заслугоўвае асуджэння, на думку Ф. Скарыны, не толькі той, хто не падпарадкоўваецца волі Бога, але і той, хто не ведае яе прадпісанняў. У прадмове да Біблії Ф. Скарына пісаў: «У гэтай кнізе змешчаны ўсе законы і правы, якімі людзі павінны кіравацца на зямлі».

Кананічнае права – гэта каноны (пастановы), прынятыя царкоўнай уладай.

У земскім праве ў залежнасці ад грамадскіх адносін, што рэгуляваліся пэўнымі нормамі, Ф. Скарына вылучаў: паспалітае права, якое ўключала ў сябе нормы грамадзянскага і сямейнага права, міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае.

Прапанаваная ім класіфікацыя права садзейнічала развіццю не толькі тэарэтычных уяўленняў аб праве – яна выкарыстоўвалася ў дзейнасці юрыстаў-практыкаў. Так, пры стварэнні першага сістэматызаванага зводу законаў ВКЛ – Статута 1529 года – была выкарыстана класіфікацыя права, прапанаваная менавіта Ф. Скарынам.

Выказваўся Ф. Скарына і аб мэце крымінальнага пакарання. З аднаго боку – гэта застрашэнне злачынца, з другога боку – яна выконвае выхаваўчую функцыю: папярэджвае асоб, здольных да злачынства. Погляды Ф. Скарыны на дзяржаву і грамадства адпавядалі свайму часу, што гаворыць аб грунтоўных ведах мысліцеля, які суадносіў сваё бачанне ўладкавання грамадства з набыткамі, існуючымі ў еўрапейскіх краінах. Гэта бачна ў ідэях Ф. Скарыны аб усталяванні дзяржавы, дзе першае месца ён аддае закону і праву.

Ф. Скарына быў першым беларускім мысліцелем, які паставіў і разгледзеў праблему суадносін права і закона. Пад паняццем права ён разумеў сістэму раннехрысціянскіх маральных норм, якія стварылі ідэал права – права натуральнага. Ён імкнуўся вызначыць яго сутнасць і лічыў, што дасканаламу ў інтэлектуальным і маральным сэнсе чалавеку законы не патрэбны, ён кіруецца ў грамадскім жыцці натуральным законам. Гэта пераклікалася з поглядамі антычных філосафаў, у прыватнасці, Арыстоцеля.

У той жа час Ф. Скарына добра разумеў неабходнасць права ва ўмовах грамадства. Закон павінен служыць агульнаму дабру і грунтавацца на маралі, справядлівасці і чалавекалюбстве. Менавіта на аснове гэтых прынцыпаў, лічыў ён, і павінны складацца юрыдычныя законы, выконвацца правасуддзе, ажыццяўляцца дзяржаўнае кіраванне і палітыка. Закон павінен быць годным для выканання, карысным для насельніцтва і адпавядаць звычаям, часу і месцу.

Не адмаўляючы існавання ў грамадстве маёмаснай няроўнасці, Ф. Скарына з'яўляўся прыхільнікам сацыяльнай справядлівасці: прапагандаваў роўнасць, аднолькавую адказнасць грамадзян перад законам, незалежна ад іх сацыяльнага і маёмаснага становішча. Суддзі абавязаны судзіць людзей справядліва, не браць хабару, не перайначваць законаў. Грамадства павінна грунтавацца на міры і згодзе, бо ад гэтага залежыць дабрабыт усёй дзяржавы, а ўзаемаадказнасць паміж «багатымі» і «убогімі» складвацца на аснове «братолюбия».

Важна таксама адзначыць, як Ф. Скарына ставіўся да сацыяльнай структуры грамадства. Ён лічыў неабходным наладзіць адносіны паміж рознымі слаямі насельніцтва. Паколькі ў грамадстве існуюць розныя саслоўі, клопатам манарха павінна быць рэгуляванне іх адносін з дапамогай законаў. Стварэнне такіх законаў з'яўляецца галоўным абавязкам правіцеляў дзяржавы. Узорамі для мудрага ўладкавання дзяржавы для Ф. Скарыны служылі антычныя стваральнікі законаў. Свае надзеі на паляпшэнне сацыяльных адносін ён звязваў з дзейнасцю польскага караля і Вялікага князя Літоўскага Жыгімонта І, які быў прыхільнікам дэмакратычных змен у дзяржаве. Ф. Скарына верыў у дасканалую прававую дзяржаву, у роўнасць і сацыяльную справядлівасць. Служэнне грамадству Ф. Скарына параўноўваў са служэннем Богу. Чалавек у разуменні Ф. Скарыны – найвышэйшая каштоўнасць.

Усталяванне ў грамадстве законнасці і правапарадку залежыць, на думку Ф. Скарыны, ад тых, каму наканавана быць манархам, правіцелем, і чыё жыццё і дзейнасць павінны служыць прыкладам для народа. Узорнымі правіцелямі ён лічыў Саламона, Пталамея Філадэльфа, Салона, Лікурга, Нуму Пампілія і іншых старажытных цароў і філосафаў-заканатворцаў. Правіцель павінен быць набожным, мудрым і справядлівым, адукаваным, дабрачынным і чулым да сваіх падданых. І галоўнае – гасудар павінен кіраваць дзяржавай у строгай адпаведнасці з законамі, сачыць за справядлівым выкананнем правасуддзя. Адначасова ён павінен быць моцным і грозным, умець у неабходных выпадках абараніць свой народ. Ф. Скарына лічыў асветную, гуманную і моцную манархію лепшай формай кіравання грамадства, а адукаванага манарха – тым кіраўніком, які можа заслужыць павагу і любоў грамадзян, уладкаваць найлепшым чынам жыццё народа.

Ф. Скарына – прыхільнік свабоды ў розных праявах чалавечай дзейнасці. Яго ідэя свабоды вызначаецца нацыянальна-культурнай накіраванасцю. Гэта дае падставы лічыць вялікага мысліцеля прадвеснікам свабоды і дэмакратыі.

Ф. Скарына развівае таксама ідэю грамадскага дагавору, у ажыццяўленні якога бачыць аснову сацыяльнай гармоніі ў грамадстве. Парушэнне дагавору, на думку Ф. Скарыны, вядзе да дысгармоніі, распальвае варожасць паміж людзьмі. Таму, спасылаючыся на Біблію, гаворыць «А справуйте все шіре, нет бо пред господем богом нашім неправості ані бракованья особ, ані пожеданья даров». Пазней гэтыя словы былі выкарыстаны ў якасці эпіграфа да Статута ВКЛ 1529 года, прасякнутага ідэямі Ф. Скарыны аб прыярытэце мясцовага права, заснаванага на звычаёвым праве і судова-адміністрацыйнай практыцы, а таксама аб адзінстве права для усіх людзей, аб іх роўнасці перад законам.

Ф. Скарына быў не толькі вучоным-прававедам, але і юрыстам-практыкам. Ён выступаў у судах як абаронца асабістых інтарэсаў і інтарэсаў сваіх блізкіх. У 1532 годзе Ф. Скарына атрымаў спецыяльны прывілей, згодна з якім ён вызваляўся ад юрысдыкцыі ўсіх мясцовых судоў і ўсе абвінавачванні і іскі супраць яго маглі прад'яўляцца толькі ў вялікакняжацкі суд.

Памёр Ф. Скарына каля 1551 года. Безумоўна, з'яўляючыся сынам сваёй эпохі, ён абгрунтаваў ідэальную мадэль дзяржаўна-прававога ўсталявання грамадства, якая з'яўляецца вось ужо на працягу пяці стагоддзяў пуцяводнай зоркай для ўсяго чалавецтва. Ідэі Ф. Скарыны наконт дасканалай прававой дзяржавы, роўнасці і сацыяльнай справядлівасці паміж людзьмі і адукаванага правіцеля абуджаюць да роздуму ўсё новыя пакаленні. Асоба Ф. Скарыны стаіць побач з такімі выдатнейшымі дзеячамі Адраджэння, як Леанарда да Вінчы, Рафаэль, Мікеланджэла, Томас Мюнцэр, Эразм Ратэрдамскі, Томас Мор і іншыя, а беларуская культура, на ніве якой ён працаваў, – на адным узроўні з еўрапейскай. І цікавасць да яго дзейнасці і творчасці не знікне, бо гэта агульнае дасягненне чалавечай культуры.